**Форум.** Урачыстае адкрыццё X Міжнароднага кангрэса «Бібліятэка як феномен культуры», прымеркаванага да Года міру і стваральнай працы, адбылося ўчора, 19 кастрычніка, у канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Арганізатарамі кангрэса з'яўляюцца Міністэрства культуры і Нацыянальная бібліятэка Беларусі, суарганізатарам — Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. У мерапрыемстве прымаюць удзел больш за 400 дэлегатаў з Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Інданезіі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана. Сярод іх — прадстаўнікі найбуйнейшых бібліятэк, музеяў, выдавецтваў, навукова-даследчых арганізацый і адукацыйных устаноў, вытворцы праграмнага забеспячэння, тэхнічных сродкаў, інфармацыйнай прадукцыі і прамысловага абсталявання для бібліятэк.